Міхал Анемпадыстаў

# глыбока глыбока на дне філіжанкі кавы



Галерэя Б

Міхал Анемпадыстаў

# Глыбока глыбока на дне філіжанкі кавы

Логвінаў

ГАЛерЭЯ Б

Галерэя
Калекцыя заснаваная ў 1998 г.

Куратар калекцыі
Ігар Бабкоў

ISBN 978-985-562-034-2

© Анемпадыстаў, М., 2014
© Выдавец І. П. Логвінаў, 2014

# ТЭКСТЫ

## На дне філіжанкі кавы

Глыбока-глыбока, на дне філіжанкі кавы
Пачынаецца новы дзень, доўгі і невядомы
Водару сьцяг уздымаецца ў неба
Урачыста-гаркавы, як перамогі і страты
Цёмна-брунатны, як вопратка вояў і мніхаў
Як хлеб, як ральля, як атрамант, як ноч
Колер для літараў, нотаў, малюнкаў
Смак спатканьняў на некалькі словаў
На адну філіжанку, на момант, які застанецца
З намі альбо паасобку ў кожнага з нас
На кожны глыток
Па паэме, кантаце, партрэце. Вось і апошні
Мінае дзень. Няма чаго варажыць на гушчы
У пустой філіжанцы не адбіваецца неба

## Гадаваньне Гадо

Мы гадавалі Гадо.
– Што з таго. Гэта было даўно!
– Так, даўно. Але ўсё адно –
Гэта мы гадавалі Гадо.

Мы гатавалі ежу,
Давалі пітво
І чыталі кніжкі Гадо.
Да прыкладу, Герадота,
І Бэкета, паміж іншым,
І Ёнэску давалі,
А нажы ды нажніцы хавалі.

І вучылі трымацца на хвалі.
А яшчэ даравалі, каралі.
На Каляды давалі каралі
І бралі на балі,
Калі гэта трэба было
Для Гадо ці для гадаваньня яго.
(Альбо выхаваньня?)

Дакладна вядома адно:
Гэта было даўно.
І такою працяглаю
Гэта зрабілася зьявай,
Што сталася мройнаю явай
Наша жыцьцё.

Стаміліся мы
Ад гадаваньня Гадо
І нарэшце сказалі: – До!

А наш гадаванец Гадо
Стаў годны, і гожы, і здатны,
Да розных пасадаў прыдатны,
І аднойчы Гадо апрануў паліто
І ў шыкоўным аўто
Паехаў паціху туды,
Дзе блакітнае неба
І болей дамоў
Фарбавана набела.

Вось сядзім і чакаем.
Глядзім праз вакно.
Гэта мы гадавалі Гадо.

***

Ад былых палацаў белых
Захаваўся толькі вецер.
Ад былых палацаў чорных
Захаваўся толькі колер.
Я фарбую ў гэты колер
Свой абутак і адзеньне,
Каб у гэтым чорным строі
Пад крывіцкім шэрым небам,
Калі хопіць вапны, цэглы,
Свой палац пабудаваць.

## Вакно

Амаль што кожны дзень
Гляджу ў сваё вакно
Знаёмы краявід
Вітаю я праз шкло

Знаёмы краявід
Няма на што глядзець
Завулак дрэва мур
І вуліца ледзь-ледзь

А неўзабаве ўсё
Сышло на дол як дым
І толькі шэры брук
Ляжыць на мейсцы тым.

Аднойчы смоўж прапоўз
На шкле пакінуў сьлед
Аднойчы вецер дзьмуў
Кавалкі нёс газэт

Але раз-пораз там
Па-за халодным шклом
Я бачу даўні сад
Я чую дзіўны звон

## Альтэрнатыва шэрай сьцяны

Альтэрнатыва шэрай сьцяны
Стане таксама сьцяной.
Мур адаб'ецца мурам.
Два раўналеглых муры –
Калідор.
Цэгла на цэглу, сьцяна да сьцяны –
Будуецца горад.
Яго жыхары
Прачытаюць на золку
Каменныя вершы,
Дзе ўсё дасканала, бяз хібаў,
І кожнае слова на месцы
Бетонам замацавана.
Нехта намацае словы
І знойдзе свае,
А той, хто ня знойдзе, –
Пойдзе.
І на ўскраіне места,
На недабудаваным муры
Ён намалюе ружу,
Ружова-бездапаможную.
Але наўрад ці хто-небудзь
Аднойчы пабачыць яе.
А раптам хто і пабачыць,
Дык вачам сваім веры ня дасьць
І трапна дадасьць
Што-небудзь агіднае.
Брыдкае.

## Пан крот

Хмары і мары,
Малочныя бары,
А крот тым часам рые.
Неба і зоркі
І плач перапёлкі,
А крот тым часам рые.
Танкі і панкі
І хіпі-падранкі,
А крот тым часам рые.
Гмахі і дахі,
Мы вольныя птахі,
А крот тым часам рые.
А крот тым часам,
А крот тым часам,
А крот тым часам
Рые, рые, рые.
Пан крот рые.

## Пан крот 2

Кратае краты крот,
Закратаваны ў нары.
А там, на гары,
Сёньня сьвята травы.
Там гарацЬ ліхтары,
Дзеці паляць вагні
І лётае зьмей папяровы.

Кратае краты крот,
Пернік кладзе сабе ў рот.
Добра ў нары –
Земляныя муры
Не разбураць зьвяры,
Не зруйнуюць вятры,
І краты, як трэба, – з дрэва.

А дзеці сьмяюцца і паляць вагні,
Малыя дурныя дзеці...
«Неспакойна ў сьвеце, нешта гарыць», –
Думае крот.
І нюхае дым.

## Начная варта

Вартуе горад
Начная варта
Там дзе ня трэба
Хадзіць ня варта

Сядзіце ціха
Сядзіце дома
Замкніце дзьверы
Ключы схавайце

Закрыйце вокны
Пастаўце краты
Запхніце дзіркі
Замажце поры

Наводзьце глянец
Зьнішчайце плямы
Працуйце плённа
Прасуйце прасам

Чытайце прэсу
Пішыце скаргі
Лічыце грошы
Натуйце лічбы

Гадуйце рыбак
Гатуйце страву
Варыце ежу
Каштуйце віны

Мацуйце целы
Ратуйце душы
Сьцяліце ложкі
Здымайце порткі

Лягайце моўчкі
Прымружце вочы
Прысьніце сонца
Што ўзыдзе ранкам

## Цемра

Цемра
Людзі ўстаюць з ложкаў
Людзі п'юць цёплую каву
Людзі рушаць на працу
Каб адбыць там свой час
І рушыць дамоў

Цемра
Людзі вяртаюцца з працы
Людзі здымаюць адзеньне
Людзі кладуцца ў ложкі
І кахаюць адно аднаго
Ці самі сябе

Дай мне веру
Дай мне надзею
Дай знак таго
Што гэта патрэбна табе

Не, ня трэба ніякіх знакаў
І веры ня трэба, а толькі
А толькі крыху надзеі
Каб не памерці тут
Ад дзіўнай хваробы

Першая фаза якой
Агульная млявасьць
Другая фаза якой
Страта веры ды сэнсу
Трэцяя фаза якой
Сьмерць і труна
Чацьвертая фаза якой
Глеба ды цемра

Цемра
Людзі ідуць на працу
Людзі прыходзяць з працы

## Вера ахвяры

Электрычныя песьні
Трансфарматарных будак
Сьпявае штовечар
П'яны электрык.
Электарат галасуе,
Электарат абірае
Дотык да току.
Гэта так проста.
Дотык да току –
Раптоўная сьмерць.

Герэтычныя тэксты
Забароненых кніжак
Чытае штоночы
Новы рамантык.
Электарат галасуе,
Электарат абірае
Кубак атруты.
Гэта прыгожа.
Кубак атруты –
Салодкая сьмерць.

Нефармальныя формы
Трамвайнае мовы
Стварае шторанку
Гідрамэханік.

Электарат галасуе,
Электарат абірае
Ключ на сямнаццаць –
Брутальная сьмерць.

Таямнічыя знакі
На сьценах будынкаў
Малюе штодзённа
Сын інсургента.
Электарат галасуе,
Электарат абірае
Веру ахвяры,
Верную веру,
Веру ахвяры –
Ахвярную сьмерць.

## Радыё Сталін

Ультралевыя хвалі
Лепей прымацца сталі.
Тварам да сьценкі
У актавай залі
Мы слухаем
Радыё Сталін.

Гаворыць Радыё Сталін.
Слухайце, вы замаўлялі.
Праграма па вашых заяўках,
У этэры канцэрт пажаданьняў.

Гэта музыка вязьняў,
Гэта танцы палонных,
Гэта сьвята памерлых,
Гэта Радыё Сталін.

***

На белы аркуш
Чорны атрамант
Дажджом пральецца
Упарадкаваным,
З радкоў паўстане
Чорна-белы сад,
Такі дагледжаны
І вырафінаваны.
І будзе там спакой і цішыня,
Пакуль ня прыйдзе
Старшыня лясгасу,
Які парушыць
Хараство і лад
Чырвоным зьзяньнем
Форменых лямпасаў.
Ніхто не запытаецца ў яго
Пра мэтазгоднасьць
Гэтага ўчынку.
Пакуль яго аднойчы
Не заб'е
Адна
Экзальтаваная
Дзяўчынка.

## Баляда пра канс ьпірацыю

Мы сустрэліся ў катакомбах
Падчас чарговай аблавы.
Вы казалі пра неабходнасьць
Абароны граніцаў анкляву.

Вы казалі пра незалежнасьць,
Пра свабоду і пра братэрства.
Вы казалі, і Вашыя словы
Мне калолі балюча сэрца.

Вы казалі пра сродкі і мэту,
Вы казалі рашуча і шчыра:
Прыгадалі пра лёзунгі эта,
Нагадалі пра тактыку іра.

А імя Вы свайго не назвалі,
Патлумачыўшы ўсё канспірацыяй,
І на золку сышлі са схову,
Прыхапіўшы пакет пракламацыяў.

І ніхто Вас ня бачыў болей
Ні на вуліцах, ні ў падпольлі.
Можа, Вас пасадзілі за краты,
Можа, Вас расстралялі ў полі,

Можа, Вас зачапіла аскепкам,
Можа, цэглаю Вас заваліла,
Можа, Вас пераехала танкам,
Можа, снайпера куля забіла.

***

Падае сьнег зранку
Ціхаю калыханкай
Ён камуфлюе танкі
Пад цукровую вату

Падае сьнег долу
Дзеці ідуць у школу
Мы шпацыруем дадому
З учорашняе імпрэзы

Падае сьнег чысты
Сьветлы, як экзарцыста
Ён такі ўрачысты
Што нам хочацца піва

Падае сьнег новы
На звар'яцелы горад
На нашы дурныя галовы
Ды на разумныя твары

Падае сьнег зь неба
Моўчкі фарбуе глебу
Пахне паветра хлебам
Мы чакаем Калядаў

Падае, падае
Е-е-е-е-е
Падае сьнег на цябе, на мяне
І падае надзею

## Мы чакаем Калядаў

Мы чакалі Калядаў з маленства,
Ды ніяк не маглі дачакацца.
Тату трэба было на работу,
Маці трэба было на працу.

А Гагарын ляцеў на ракеце
Па-над нашым дваром ды садам,
Мы глядзелі ўсьлед са зьдзіўленьнем
І міжволі чакалі Калядаў.

Мы ўвосень падпальвалі лісьце,
Мы ўзімку хварэлі на глянды
І, прыклаўшы далоні да вуснаў,
У цямрэчы чакалі Калядаў.

Мы пісалі ў школе дыктоўкі,
Нас вадзілі глядзець на парады,
Прафсаюз дараваў карамэлькі,
Мы бралі і чакалі Калядаў.

Нам даводзілі, хто мы і што мы,
Нас вучылі выконваць загады,
Нам казалі, ды мы ня чулі –
Мы ўпотай чакалі Калядаў.

Мы рабілі высновы хутка,
Мы павольна сьпявалі баляды,
Мы на злосьць валасы расьцілі
І ўпарта чакалі Калядаў.

Што з таго, што ўсё гэта зьнікла,
Быццам бурбалкі ад ліманаду.
Засталіся сям'я і дзеткі,
Засталося чаканьне Калядаў.

Позна ўвечары посуд памыем
І пакінем, каб сохнуў на тацы.
Мы чакаем Калядаў з маленства,
Ды ня можам ніяк дачакацца.

## Пілёты

Цэпеліны ў небе,
Неба ў цэпелінах –
Яны плывуць між аблокаў
Пагрозьліва ды павольна.

Гэтаксама павольна
Цягнуцца іхнія цені,
Зазіраючы проста ў вокны,
Аблізваючы пабудовы.

Пілёты маўклівых машынаў
Сядзяць у жалезных кабінах,
Цесных ды няўтульных,
Болей падобных на карцэр.

Фосфар прыборных дошак
Гарыць у зялёным паўзмроку,
Паветра пахне іржою
Ды гарэлай пластмасай.

Пілёты сядзяць нерухома.
На іхніх чорных камбэзах
Срэбрам блішчаць адзнакі
Невядомае краіны.

Іхнія твары пакрытыя
Тонкім празрыстым лёдам.
Дужкі ад мікрафонаў
Крывяцца, быццам усьмешкі.

Зашклянелыя вочы позіркам
Роўным ды неадрыўным
Глядзяць на зорку Вэнэру,
Якая ўзышла над Зямлёю.

## Неба мяняе колер

Сустрэліся на дарозе,
Спыніліся, каб павітацца.
Нехта сказаў: – Глядзіце,
Хутка павінна пачацца.

Стаім пасярод дарогі,
На неба глядзім з-пад далоні.
Неба мяняе колер
Павольна, няўхільна, няўмольна.

Сіні, блакітны, белы.
Белы, чырвоны, чорны.
Мы ўглядаемся ў неба,
Неба мяняе колер.

Неба мяняе колер,
Неба нам шле сыгналы.
Мы іх не разумеем,
Мы іх не ўспрымаем.

Альбо ўспрыняць ня хочам,
Альбо зразумець ня можам.
Божа, даруй нам гэта
І ўратуй нашых дзетак.

***

Над горадам шэрая хмара
Макабрычных памераў.
Чырвоны фабрычны комін
Поўны вады, як калодзеж.

Вада залівае горад:
Вуліцы, плошчы, сквэры.
Мы заплюшчылі вочы,
Мы зачынілі дзьверы.

Мы ня ўмеем плаваць,
Мы памрэм пад вадою.
І маўклівыя рыбы
Будуць жыць у нашых пакоях.

Давай памаўчым таксама –
Ціша мацней за слова.
Ты мяне разумееш,
І гэтага дастаткова.

Гэта падводнае гета.
Тут не хапае паветра,
Тут альбо вучысься плаваць,
Альбо канаеш паціху.

Стаім у вадзе па горла,
Зьнямелыя, ды не зважаем
На тое, як неяк павольна
Падобныя сталі да рыбаў.

І мы пачынаем дыхаць,
І нам пад вадою добра,
Калі толькі гэтую вадкасьць
Можна назваць вадою.

## Мая краіна

Я люблю, калі сьвеціць сонца
Рана ранкам праз фіранкі.
Я люблю пах сьвежае кавы,
Я люблю смак смажанай бульбы.
Мне падабаецца водар парфумы,
Мне падабаецца дым цыгарэтаў.
Я люблю халодныя блюзы,
Я люблю свае джынсы старыя.

Я жыву ў гэтай краіне –
Мая краіна пад белым сьнегам,
Мая краіна пад белым сьцягам,
Пад белым сьцягам з чырвонай стужкай.

Я зь цягам часу стануся птушкай,
Распраўлю крылы, зраблю тры крокі
І падымуся па-над зямлёю,
Туды, дзе вецер і дзе аблокі.
Над краінай пад белым сьнегам,
Над краінай пад белым сьцягам,
Пад белым сьцягам з чырвонай стужкай –
Мая свабода.

Мая свабода – зь ветрам нязгода
І асалода супрацьстаяньня.
Мая свабода – човен падводны
Паміж Сцылаю ды Харыбдай.

Мая свабода – дом папяровы
Паміж Гамораю ды Садомам.
А там, за домам, край невядомы
Пад белым сьнегам, пад белым сьцягам.

Зь цягам часу складанымі сталі
Законы гульні,
А неяк раней усё проста было
І мы былі.
Мы проста ішлі,
Мы проста стаялі,
Мы проста жылі
І паміралі

У сваіх падводных чоўнах,
У сваіх дамах папяровых,
Паміж Сцылаю ды Харыбдай,
Паміж Гамораю ды Садомам,

У краіне пад белым сьнегам,
У краіне пад белым сьцягам.

***

На нашай вуліцы
Усё звычайнае:
Таполі пыльныя,
Дамы панэльныя,
Двары квадратныя,
Пад'езды брудныя,
Жыцьцё нармальнае,
А людзі розныя.

На нашай вуліцы
А пятай раніцы
Апошні п'яніца
Дамоў вяртаецца,
Дамоў вяртаецца,
Ідзе, хістаецца
І брудна лаецца
На нашу вуліцу.

На нашай вуліцы
А шостай раніцы
Дымяцца коміны
На хлебнай фабрыцы,
Дымяцца коміны,
Працуе фабрыка
І пахне печывам
На нашай вуліцы.

На нашай вуліцы
А сёмай раніцы
У сем'ях чайнікі
На пліты ставяцца,
Канапкі робяцца,
Яешні смажацца –
Усе нэрвуюцца,
Усе сьпяшаюцца.

На нашай вуліцы
А восьмай раніцы
Сонца ў вокнах
Дамоў адбіваецца.
Мой брат ля вакна,
Мой брат усьміхаецца,
Мой брат нікуды
З'яжджаць не зьбіраецца,
Бо брату майму
Жыць падабаецца
У гэтым доме
На нашай вуліцы.

## Цудоўны вечар

Цудоўны вечар,
Мы палім сьвечкі,
Гуляем у спрэчкі
І плавім воск,

Мы п'ем гарбату,
І водар гаркавы
Паміж намі
Будуе мост.

Кахаем аднойчы,
То двойчы, то тройчы,
Вочы ў вочы,
То недзе, то тут,

Яна пазірае ў вакно і ня раіць
У пошуках раю лезьці ў бруд.

Старыя рэчы
Заўсёды дарэчы,
Рукі на плечы,
Апошні баль...

Танчым аднойчы,
Танчым адвечна,
Можа, на радасьць,
А можа, на жаль.

## Калыханка для дарослых

Ці помніш ты, як прабівала
Трава маладая панцыр асфальту
Ці помніш ты, як выглядала
Новае неба над новай краінай

Ці помніш ты, як у паветры
Пахла вясною ды ветрам свабоды
Ці помніш ты, якой была моцнай
Падвойная кава, што нас ратавала

Ці помніш ты начныя вандроўкі
Па стомленай цішы вуліц бязьлюдных
Ці помніш ты, як несьлі глупоту
І шэптам казалі розныя бздуры

Ці помніш ты, як потым дадому
Вярталіся ранкам а пятай гадзіне
Ці помніш ты, як мала спалі
Ці помніш ты, як шмат прысьнілі

Ці помніш ты? Ці я памятаю?
Цішэй, калі ласка, я засынаю...

## Яшчэ адна калыханка

Летні дзень адышоў на захад,
Змоўкла лаянка на двары.
Па пэрымэтры нашай краіны
Загараюцца ліхтары.

І гараць да самога сьвітанку,
Падзяляючы час і прастору,
Аддаляючы сьветлае заўтра,
Набліжаючы сьветлае ўчора.

А ў нас пад вакном шыпшыны.
А ў нас на вакне фіранкі.
Засынай, маё дзіцятка-зернетка,
Сьпі спакойна да самага ранку.

Будзе золак, узыдзе сонца,
Жыццядайным сьвятлом разальецца.
Ты прачнесься, расплюшчыш вочы
І ўбачыш, як уварвецца

Новы дзень на абшары краю
Адначасна па ўсіх напрамках.
Засынай, маё дзіцятка-зернетка,
Заўтра будзе цудоўны ранак.

## Здаецца...

Здаецца, той дом стаяў на ўскраіне места
На вуліцы зь цёплага пылу і плотаў драўляных
Пад грушай вялікай, якая ўжо не радзіла
Затое давала шмат ценю ў летнюю сьпёку

Здаецца, той дом быў пабелены некалі вапнай
Ля дому быў кветнік, а ў ім – незьлічоныя кветкі
На тле белых сьценаў найлепей глядзеліся мальвы
Увогуле мальвы заўсёды глядзяцца няблага

Здаецца, той дом меў блакітна-зялёныя дзьверы
Яго гаспадар з гаспадыняй былі ўжо вельмі старыя
Яны гаварылі пра сьмерць і пра кветкі
У доме была цішыня і паўцемра

Здаецца, у доме былі мы ня болей за колькі хвілінаў
Але калі выйшлі адтуль, то было ўжо цёмна
У цемры быў прывідны водар лілеяў і мяты
Паблізу ў ваду гучна падала кропля

Пазьней мы дарэмна чакалі апошні аўтобус
На вуліцы зь цёплага пылу і плотаў драўляных
Хацелі паліць, але ў нас не было запальнічкі
Хацелі вярнуцца ў дом, але нам не ставала нахабства

## Шафа

У нашай чароўнай, шыкоўнай шафе
Людзям на радасьць выштукаванай
Нешта шкрабецца, нешта шапоча
Нешта варушыцца і замінае
І замінае мне думаць спакойна
Пра розныя дробныя хатнія справы
Пра каву бяз цукру, пра цукар бяз кавы
Пра тое, што грошай ізноў не хапае
Пра тое, што трэба плаціць за кватэру
Пра тое, што трэба залатвіць паперы
Пра кроплі да носу, пра грэчку ды проса
Пра цёплую печку, пра дым папіросны
Пра нашу цудоўную шафу старую
Якую я выкіну ці расьпілую
Таму што ў шафе нешта шапоча
І мне невядома, чаго яно хоча
Чаго яно хоча, чаму замінае
Мне думаць спакойна пра хатнія справы

* * *

«Там заўсёды сьвежы  хлеб», – кажа мая бабуля,
Выпраўляючы мяне ў дальнюю краму.
Іду кароткай дарогай праз доўгія летнія дні,
Густыя й цягучыя, быццам ліпеньскі мёд.
Празь зялёнае золата бязьлюдных двароў,
Дзе бэз, язьмен і шыпшыны квітнеюць адначасова.
Зьбітыя калені, драпіны і барадаўка на левай руцэ.
У правай трымаю хлеб.
Ня ведаю, што яшчэ сказаць пра сябе...

## Шуфляды

Вочы заплюшчваю і адчыняю шуфляды
Вось Нафталінавая шуфляда
Там ёсьць процьма розных цікавых рэчаў
Але найцікавейшыя з усіх – гузікі і капялюшы

Вось Ванільная, Імбірная і Кардамонавая шуфляды
Яны малыя па памеры, але ў кожнай
Заўсёды знойдзецца смачная неспадзянка

У Мандарынава-Шыльнікавай шуфлядзе
Каляды і Новы год спрачаюцца шэптам
Хто зь іх найгалаўнейшы і больш легітымны

А Шпрота-Сэрвілятную шуфляду
Лепш не адчыняць, бо там
Напэўна шмат гасьцей, тлум і гармідар

Прыемна і крыху боязна зазірнуць
У Сьнегавую шуфляду, дзе мокрыя боты
Сохнуць пад наглядам бацькоўскага паса

Побач Эўкаліптава-Шкіпінарная шуфляда
У ёй, закаркаваныя ў бутэлькі ды слоікі
Сумуюць кашаль, возгры ды тэмпэратура

Увогуле можна правесьці ўсё жыцьцё
За гэтым цікавым заняткам
Але пісаць пра гэта так доўга
Відаць, ня варта

## Вуліца

У адной з шуфлядаў была вуліца.
Яна пачыналася вільготным паветрам,
Доўжылася плыткім сьнегам,
Уздымалася на пагорак мурамі старых камяніцаў.

Каб там, на самай вяршыні пагорка,
Ці то распачаць нябачны нам рух долу,
Ці то раптоўна спыніцца перад нябачным урвішчам.

Пэрспэктыва вуліцы была нагэтулькі дасканалай,
Што мы падпарадкаваліся агульнаму руху.
І каб хто-небудзь зазірнуў на той момант у шуфляду,

То ўбачыў бы нас у канцы вуліцы на вяршыні пагорка.
Куды мы падзеліся пасьля
І што з намі сталася пазьней –
Невядома.

## Дзьверы

Наступным ранкам
Мы ізноў падышлі да дзьвярэй
Але гэтым разам
Варты там не было

Не было каму
Спраўджваць асобу
Рабіць дагляд
Праводзіць допыт
Браць падпіску

Але гэтаксама
Не было каму
Даваць дазвол
Ставіць пячатку
Адмыкаць замок
Адчыняць дзверы

Дарэмна прачакаўшы да вечару
Мы вярнуліся ў сутарэньні
І паклаліся ў свае ложкі

***

Цёмным зімовым ранкам,
Калі дворнікі шкрабуць
Шуфлямі па лёдзе,
З пачуцьцём віны і самоты
Іду па дарозе да школы,
Ведаючы, што сёньня
Абміну школьную браму
І, хаваючыся ад непрыемнасьцяў,
Сяду ў цёплы аўтобус,
Які павязе мяне
У невядомым кірунку.
Буду слухаць, як вурчыць матор,
Хукаць на замёрзлае шкло
І пазіраць праз адтуліну
На людзей, дамы і дрэвы.
На апошнім прыпынку
Выйду на халоднае паветра.
Буду здалёк глядзець
На вар'ятню.
Буду доўга глядзець на вар'ятню.
Ажно пакуль не захочацца
Вярнуцца дадому.

## Атрамантавы Кот

Ягамосьць Атрамантавы Кот
Асоба без грамадзянства
Апошні абаронца Старога Места
Вартаўнік пакінутых дамоў

Скарбнік непатрэбных рэчаў
Знаўца гарышчаў ды сутарэньняў
Усюдыісны сьведка і наглядальнік
Самотны і самадастатковы

Сёньня раніцою сканаў
Ад хранічнай хваробы сэрца
Сярод палыну і друзу
Ляжыць атрамантавай плямай

Пахаваем яго пад каштанам
Бязь сьлёзаў і шкадаваньняў
Запалім вогнішча
Будзем слухаць агонь

## 25, 26, 27

– Дваццаць пяць, дваццаць шэсьць,
двaццаць сем, праверка сьвязі...
Как слышыце меня, прыём!
– Слышым нармальна,
Нармальна...

– Дваццацьпятачка, далажыце абстаноўку.
– Абстаноўка нармальная, праходы перакрыты.
Перакрыты.

Нармальна...

– Дваццаць шэсьць, как у вас сітуацыя?
– Сітуацыю кантраліруем.
– Блакіруйце і расьсякайце!
– Блакіруем і расьсякаем!
Расьсякаем.

Нармальна...

– Дваццаць сёмы, пачаму маўчыце?
– А ў нас згарэў прэдахраніцель.
– Ну дык вызавіце ж (піп) пажарнікаў!
– Пажарнікаў вызвалі. Вызвалі пажарнікаў.

Нармальна...

– Дваццацьпятачка, вы праход перакрылі?
– Праход перакрылі.
– А пачаму тут тада (піп) столькі людзей?
– Прычыну выясьняем.

Нармальна...

– Дваццаць шэсьць, дакладывайце!
– Блакіравалі і расьсяклі на часьці.
– Начынайце зачыстку!
– Зачыстку начынаем.
Начынаем.

Нармальна...

– Дваццаць сёмы, как слышыце меня?
– Слышым Вас очэнь харашо, очэнь харашо!
– Што ў вас з прэдахраніцелям?
– Прэдахраніцель прэдахраняет.
– Не ўвлекайцесь! (пііп)

Нармальна...

– Усем адбыць на мейсца дыслякацыі.
Людзям аддыхаць, а з вамі буду разьбірацца!
Как настраеніе (пііп) мацеры?
– Настраеніе нармальнае,
Нармальнае...

Тагда нармальна...

## Сьвятло ў цемры

Навакольле ў сутоньні тоне
Цемра лезе праз падваконьне
Лезе ў душу і сьлепіць вочы
Цемра хоча каб гэтае ночы
Не было ні сьвятла ні надзеі
Каб ня ведалі хто мы і дзе мы
Каб дарогу згубілі ў змроку
Каб ні духу ні руху ні кроку
Каб ціха сядзелі па норах
Каб палохаў газэтны шолах
Каб са страху замкнула мову
Каб забыліся простыя словы
Толькі гэтак ня будзе браце
Каб нам у норах кратамі памерці
Ніколі цемра сьвятло ня згасіць
Сьвятло ў цемры заўсёды сьвеціць

Сьвеціць сьвятло ў цемры
І цемра сьвятла ня згасіць
Сьвеціць сьвятло ў цемры
І цемра сьвятла ня згасіць
Сьвеціць сьвятло ў цемры
І цемра сьвятла ня згасіць

## Схаванае сэрца

Летам сьпёка, і скварь, і з тарфянікаў дым
Летам сьвятаў багата, адно за адным
І яшчэ, у дадатак, адразу за тым
Але мне не сьвяткуецца, блін

Сьвеціць тварам у твар мне горад-герой
Але ёсьць яшчэ іншы, але ёсьць яшчэ той
Занядбаны, забыты, зацюканы брат
Горад прыцемкаў, горад-вар'ят

Ён адкрые на хвілю свой скрыўлены твар
Тады, калі восень, і дрэваў пажар
Ужо дагарэў, і калі да зімы
Вымылі неба дажджы

Гэтак чыста і пуста на пляцы Цэнтральным
А за ім памірае, квартал за кварталам
Горад Менск. Памірае нязграбна, нягожа
І гары яно гарам, і памерці ня можа

Вось жа прыйдзе зіма і нашэпча замовы
І суцішыцца боль на пэрыяд зімовы
Зацярушаны сьнегам, засьне стары горад
Без Адвэнту, Калядаў і Новага году

Мінск ідзе ў сьвяточны запой тымчасова
Мне па горла стаіць, мне ўжо дастаткова
Але кліча і цягне мяне за сабой ён
Што ты робіш са мной, горад-герой мой

Цьвік заб'е Сакавік на зімовыя смуткі
Аўтазак адвязе адмарозкаў на суткі
Зарунее трава ва ўсіх накірунках
Закрасуе вясна ў зялёных карунках

Так захочацца жыць, і пад швэдрам прарэжуцца
крылы
Навальніцы і дворнікі вызваляць горад ад пылу
Горад Мінск бутафорскім алмазам зазьзяе на сцэне
Горад Менск назаўжды ў ягоным схаваецца ценю

Мастакі занатуюць, завучаць на памяць прыкметы
Сэрца Менску ў сэрцы сваім захавае мясцовы паэта
Жыхары павылазяць з утульных пракураных нораў
Будуць спраўджваць вуліц адлегласьць і плошчаў
прастору

Тут прасторы хапае, ды паветра няшмат
І дыхае цяжка горад-вар'ят
Але б'ецца і грукае сэрца ягонае
Надзейна схаванае на белым чырвонае

## Крылы анёла

Крылы анёлаў цьвікамі прабілі,
Крылы анёлаў да бруку прыбілі,
Каб не ляталі, каб не сьвяцілі
На небасхіле.

Я бачыў па тэлевізары
Доказы іхніх злачынстваў:
Некалькі белых пёрак
І сьвятло нетутэйшае.

Яно было мацнейшае
За сьвятло студыйных сафітаў.
Дыктары апускалі вочы долу.
Я не паверыў улікам.

І людзі пра тое ж казалі.
Яны хавалі сьвечкі ў далонях
І несьлі праз начны горад
Туды, дзе былі анёлы.

Калі чыталі прысуд,
Было халодна і ціха.
Кату далі новы загад,
І ён узяўся за працу.

Кат выдраў цьвікі,
Дапамог анёлам падняцца
І прыбіў крылы наноў,
Гэтым разам да неба.

Цяпер тут заўсёды
Сьветлая ноч.

## Восень

Вось яна, Восень мядзянавалосая
Плыве-праплывае сьцежкай птушынай
Па-над абшарамі шэрымі, чалымі
Па-над вазёрамі сінімі, чорнымі
Па-над ярамі і па-над пагоркамі
Па-над званіцамі стромкімі, звонкімі
Срэбнымі голкамі, там, за аблокамі
Шыліся шаты краўцамі-анёлкамі
Зь цяжкіх тканінаў брунатных адценьняў
Зь лёгкага вэлюму, шолахаў, ценяў
Сноў павуціністых, шызага золаку
Крохкае шэрані, срэбра і золата
Там, дзе ідзе яна, дзе праплывае
Поўняцца смуткам ад краю да краю
Кубкі і келіхі і навакольле
І мы паміраем бяз страху, бяз болю

Нас Восень ключом залатым замыкае
І моўчкі зьнікае за небакраем

# ШАНТЫ

***

Не пытайся як справы
Не пытайся як зьлевы
Ўсё нармальна таварыш
Над краінай залева

Але што нам залевы
І што нам патопы
Мы праблемы і роспач
Пакідаем на потым

Покуль моцы хапае
Караблі пабудуем
І далёка-далёка
Паплывем-павандруем

Па-над намі аблокі
І сто футаў пад кілем
А ўнізе глыбока
Баракальныя шпілі

Іх званіцы званамі
Нам усьлед адзавуцца
Мы аднойчы сыходзім
Каб калісьці вярнуцца

## Аку-аку

Разам з Турам Хэердалам,
Разам з Хэердалам Турам
Па марах і акіянах
Мы дрэйфуем, мы вандруем
І сьпяваем акустычна:
– Аку-аку,
Аку-аку.

А Кусто плыве пад намі
У сваёй падводнай лодцы.
Зь ім плывуць яго малойцы,
Навукоўцы-моразнаўцы,
І сьпяваюць акустычна:
– Аку-аку,
Аку-аку.

А акулы хочуць зьесьці
Акуліста бартавога.
Не дамо таго, што хочуць, –
Хай галоднымі здыхаюць.
Мы сьпяваем акустычна:
– Аку-аку,
Аку-аку.

А куды плывем-вандруем
Па марох і пад марамі,
Нам пакуль што невядома,
Ды і ведаць нецікава.

П’ем мы каву і сьпяваем
Акустычна:
Аку-аку,
Аку-аку.

Аку-аку, Акудовіч
Праплываў у байдарцы побач
І праз хвілю быў за мілю,
А празь дзьве наогул зьнік.
Усё плыве і ўсё знікае.
Сонца дыск ля небакрая.
Дзень мінае, мы сьпяваем
Акустычна:
Аку-аку,
Аку-аку.

## Мёртвы штыль

Мёртвы штыль
Спыніў караблі
Вятры завязаў
На марскія вузлы

Але не бяды
Падумалі мы
І сталі чакаць
На вецер

Дык вось, мы чакалі
На хвалі, на вецер
Пасярод акіяну
У цэнтры сусьвету

Мы палілі тытунь
І пацягвалі ром
Дым плыў угару
І нагадваў пра дом

Дом быў далёка
А неба так блізка
Поўня блішчэла
Як срэбная міса

І зоры таксама
Гарэлі над намі
Мы маглі б, каб хацелі
Іх памацаць рукамі

Але мы не хацелі
Бо навошта нам зоры
Калі рому праз край
І яшчэ ёсьць у каморы

І ў добрым гуморы
Уся наша экіпа
Боцман і кок
Лоцман і шкіпер

Толькі колькі ня пі
У канцы ўсё адно
Рана ці позна
Скончыцца ром

Позна ці рана
Падымецца вецер
Нас панясе
Па белым па сьвеце

І нам пашанцуе
Я ведаю, бо
З намі надзея
Вера, любоў

## Ultima Thule

Я палю сваю файку
Вецер дзьме мне ў сьпіну
У паўночным кірунку
Нясе мой карабель

Мой карабель
Ветразяў бель
Бі, вецер, бі
У яе, як у бубны
Дзьмі, вецер, дзьмі
Дзьмі, не шкадуй
Нясі карабель мой
На Ультыма Тхульле

Ультыма Тхульле
Чароўная выспа
Там выспацца можна
Пасьля вандраваньняў
І кожны вандроўнік
Там знойдзе прытулак
Там, на высьпе далёкай
Высьпе Ультыма Тхульле

А на той высьпе далёкай
Ёсьць корчмы і бары
Там клёцікі за дзякуй
Там піва задарма

І прыгажуні
Прагнуць каханьня
Там, на высьпе далёкай
Высьпе Ультыма Тхульле

А яшчэ там ёсьць дуб
Стары і магутны
І такі ён стары
Што стаяў там спрадвеку
І такі ён магутны
Што трымае ён неба
Каб яно ня ўпала
На выспу Ультыма Тхульле

Я палю сваю файку
Вецер дзьме мне ў сьпіну
У паўночным кірунку
Нясе мой карабель

# ПЕРАКЛАДЫ

## Аўтабіяграфія / Autobiografia (Perfect)

Меў я дзесяць год
У мяне быў руды кот
Мора часу і сяброў
Быў вялікі двор
Дрэвы вышынёй да зораў
І транзыстар Гарызонт

Ён лавіў сыгнал
У паветры плыў-лунаў
Электрычны звон гітар
Бацька піў як конь
Нам сьпявалі Ролінг Стоўнз
Нешта пра Лэдзі Джэйн

А праз год ці два
Неяк брат падараваў
Мне гітару сэканд-хэнд
Развучыўся спаць
Дзень і ноч карцела граць
І стварыць хацеў свой бэнд

Быў застойны час
Я хадзіў у сёмы кляс
Меў даўгія валасы
За каўнер хаваў
Каб пазьбегнуць заўвагаў
Час тады быў такі

Нас было трох
Звар'яцелых на рок
Але мелі на мэце адно
Граць рок-н-рол
І ісьці па жыцьці
За крокам крок

Пані Вясна
Нечакана прыйшла
На цымбалах забацала джаз
Дзякуй Вясьне
Закахаліся ўсе
У першы раз

Зьведаў кожны з нас
Першай здрады горкі смак
І салодкі смак віна
Цыгарэтны дым
Ні пра што і аб усім
Гаварыльня давідна

Адзваніў званок
Здаў экзамэн так як змог
На чатыры і на тры
Я ня стаў касіць
Мяне ў войска забралі
Я аддаў два гады

Узяў і аддаў
Мне дагэтуль шкада
Тых бязглузда патрачаных дзён

За Бугам тады
Абышоў гарады
Смутны анёл

Вецер падзьмуў
Што ты скажаш яму
Калі ён пачынае шалець
Аднекуль зь нябёсаў
Свабоду прынёс
Нам на крыле

Слухайце там!
Я пражыў гэта сам
І нікому свайго не аддам
Тое што ёсьць
Я налью да краёў
Лепшым сябрам

Тут і цяпер
Адамкнуліся дзьверы
За дзьвярыма дарогаў мільён
Скончыўся дзень
Але будзе яшчэ
Шмат новых дзён

## Белы сьцяг / Biała flaga (Republika)

Дзе ўсе яны
Дзе зьніклі твары і імёны-оны-оны-оны
Бракуе іх
Па сьвятах і ў жыцьці штодзённым-оным-оным

Разьбегліся
Па розных новых установах-новых-новых-новых
Схаваліся
У патаемных змрочных сховах-овах-овах-овах

Дзе мае сябры былыя
Дзівакі і бунтары
Часам сам сябе пытаю
Ці былі яны

Што за дзеяч
У чакалядным гарнітуры?
«А я січаз зам.зав.атдзела мінкультуры»
А што за хрэнь? Добры дзень
У вашу хату, хату скраю
«Я вас, на жаль, не памятаю-таю-таю-таю»

Дзе мае сябры былыя
Дзівакі і бунтары
Там, дзе ўсе, і там, дзе сам я
Там жа і яны

Тут яны, вось яны
Сабраліся ўсе мае сябры
Пыха звонку, пустка ўнутры
Маршыруюць разам раз два тры
З прыбамбасам пры лямпасах
Найках, Пумах, Адыдасах
Пры блякнотах і ноўтбуках хорам кажуць
мне на вуха
Кажуць: з намі будзь з намі будзь
З намі будзь з намі будзь
З намі будзь з намі будзь
З намі будзь

Дзе ўсе яны
Дзе ўсе яны
Мае сябры
Мае сябры

Дзе ўсе яны
Мае сябры
Сябры мае
Бракуе мне
Дзе ўсе яны
Мае сябры
Сябры мае
Бракуе мне

Сябры мае
Сябры мае
Бракуе мне
Бракуе мне

## Так так гэта я / Tak tak to ja (Grzegorz Ciechowski)

Скажу шчыра тое што маю
Так проста ў твар
Калі ты побач
То мне прыкра
І сорам паліць вочы мне

Каб ведаў ты
Цяпер у мяне
На кожны выпадак
Адказы ёсьць

На гэтае і на тое
Я адказы маю
І не пазьбегнеш кары ты

Хаваеш твар ад праўды
І крывіш новы іншы твар
Паслухай паслухай ну
Ужо ты надакучыў
Малпуеш ты
Усё тое што бачыш
Як ты дастаў
Дастаў кажу
Ну пачакай паб'ю люстэрка зараз – так так

Так так – там у люстэрку
Там да жалю я
Так так – я сам
Так так – там у люстэрку
Там да жалю я
Так так – я сам

Вось толькі зараз
Калі ніхто ня чуе
Бо анікога ў хаце апроч нас
Надзейна замыкаеш дзьверы і
У люстэрка кажаш
Што ты зьменіш сьвет

Я веру: ты пастараўся
А колькі ты
Перад люстэркам
Забіў тых дзён

Так так – там у люстэрку
Там да жалю я
Так так – я сам
Так так – там у люстэрку
Там да жалю я
Так так – я саааааааааам

Ужо нават я
Болей ня веру
У словы твае
Хлусіш няўмеру
Ну добра ты
Ты пастараўся
Ведаю што
Учора ня спаў ты

Так так – там у люстэрку
Там да жалю я
Так так – я сам
Так так – там у люстэрку
Там да жалю я
Так так – я саааааааааам

Так так так так так так
Так так так так так таааааак

## Свабода / Kocham wolność (Chłopcy z Placu Broni)

Мо замала кленчыў, хлусіў мо замала
Так няўдала трапіў, так нязграбна сыходжу
Так няшмат я маю, болей не набуду
Так няшмат пасьпеў я, спозьніўся паўсюдна

Свабоду не аддам нікому
Свабоду не аддасьць ніхто мне
Свабоду не аддам нікому
Свабоду не аддасьць ніхто мне

Так няшмат я маю, болей не набуду
Толькі без свабоды не хачу, ня буду

Свабоду не аддам нікому
Свабоду не аддасьць ніхто мне
Свабоду не аддам нікому
Свабоду...

Так няшмат я маю, мне хапае, зрэшты
Толькі за свабоду ўсё аддам дарэшты

Свабоду не аддам нікому
Свабоду не аддасьць ніхто мне
Свабоду не аддам нікому
Свабоду не аддасьць ніхто мне
Свабоду...

## Нязнаныя дні / Dni, których nie znamy
(Marek Grechuta)

Столькі дзён было, каб спаволіць рух
Каб зьняверыць дух, столькі хвіляў тых
Тых, што ў нябыт адляцелі прэч
Варта толькі знаць, знаць і разумець

Што тыя найлепшыя дні, што яшчэ перад намі
І будуць хвіліны ў іх, на якія чакалі
Тыя найлепшыя дні, што яшчэ перад намі
І будуць хвіліны ў іх, на якія чакалі

Нейкі знаны пан, хто меў дом і сад
Да жыцьця свайго раптам страціў смак
Неяк неўпрыкмет сад зьдзічэў і дом
Памятаў, аднак, заўсёды ён пра тое, што

Тыя найлепшыя дні, што яшчэ перад намі
І будуць хвіліны ў іх, на якія чакалі
Тыя найлепшыя дні, што яшчэ перад намі
І будуць хвіліны ў іх, на якія чакалі

Як пазнаць свой голас сярод плошчы тлуму?
Як сабраць аскепкі раскіданых думак?
Як знайсьці ў сэрцы тыя словы, фразы?
Задавай пытаньні і шукай адказы

Як сабраць у сказы дыямэнты-словы?
Як старыя песьні прасьпяваць нанова?
Як у панявер'і не пазбыцца веры?
Задавай пытаньні, часу да халеры

Тыя найлепшыя дні, што яшчэ перад намі
І будуць хвіліны ў іх, на якія чакалі
Тыя найлепшыя дні, што яшчэ перад намі
І будуць хвіліны ў іх, на якія чакалі

## Тое, што адчуваеш, тое, што ведаеш / To co czujesz, to co wiesz (Brygada Kryzys)

Ты скажы,
У жыцьці чаго ты хочаш?
Мне скажы,
Ты чаму хаваеш вочы?

Ня мусіш болей называць
Ненармальнае нармальным.
Анічога ня бойся!
Навучыся кахаць!
Хай усе навокал сьпяваюць,
І будзе ўсё так, як мае быць.

Тое, што маю, тое маё

Больш ня трэба пытаць.
І казаць больш ня трэба.
Хай полымя сэрца
Шугае да неба!
Анічога ня бойся!
Навучыся кахаць!
Хай усе навокал сьпяваюць,
І будзе ўсё так, як мае быць.

Тое, што маю, тое маё

## Яна / Lea (Louise Attaque)

Яна не анёл, не ружовы херувім
Ёй бракуе крылаў, не працуе німб
Але тут шмат такіх, неакрыленых
Невядома, дом дзе Янавы
Невядома, адкуль ідзе яна
Ад небакрая ці да небакрая
Яна
Модны антураж, у мазгах кураж
Але дапускаю, яна ня тая
Кім падаецца і як выглядае
Яна трагічна нелягічная
Яна ледзь здольная кахаць, што зь яе ўзяць
Цяпер кажа не, заўтра скажа так
Ці наадварот, заўтра скажа не
І цяжка уздыхне
Яна
На добры знак ці проста так, а быць можа не
А як не, то не, няма праблемаў
Кропка, прабел і да пабачэньня
Яна
Яна не анёл, не ружовы херувім
Яна не нэахіпі і ня хэпі міл
Яна не гераіня, яна не гераін
Яна не за янь, але і не за інь
Яна ня пальцам у неба, ня хлебам адзіным
Яна ня духам сьвятым, не ад сахі яна
Яна не з кварталу Соха, дзе блохі ад скрухі дохнуць

Яна
На добры знак ці проста так, а быць можа не
А як не, то не, няма праблемаў
Кропка, прабел і да пабачэньня
Яна не пяе і ня п’е
І халера зь ёй, каб яе
Нігілістка і абстынэнтка
Б’е аб сьценку бутэлькі
Ёй справы няма да Леі
Яна ня справа, яна ня зьлева
Нялёгка жывецца ёй
А мне няўжо лёгка?
Тоне дзень у смузе
Трэба кудысьці ісьці і мне, і ёй
Яна не анёл, не, яна не анёл
Яна
На добры знак ці проста так, а быць можа не
А як не, то не, няма праблемаў
Кропка, прабел і да пабачэньня

## Баль на гнойнай / Bal na gnojnej (Stanisław Grzesiuk)

Недаспанай ночы знойнай
Маю шчэ на вуснах сьлед
У Рудога Ёські, на завулку Гнойным
Сабраўся зладзейскі сьвет
Ані спаўшы, ані еўшы
Ёсьць затое, што наліць
Ёсць Антось, калі Антось зайграе
Трэба танчыць, трэба жыць

Гармонік на тры чвэрці ціха грае
На Гнойным баль, усё як мае быць
А я сяджу і збоку назіраю
І буду да раніцы піць

Вось Раман, з Раманам Мойра
Мойру ведаюць усе
А адзін быў нейкі новы
І няўдала кпіў зь яе
У Рамана позірк цяжкі
У Рамана востры нож
Гэты тому нешта кажа
Той адказвае штосьць

Ліхтары так цьмяна сьвецяць
Брэх сабакаў за сьцяной
Каля брамы на Рамана
Ўжо чакае новы той
Паліць ў цемры цыгарэтку

І сьціскае рэвальвер
Неўзабаве бразьне клямка
Рыпнуць дзьверы, грымне стрэл

Гармонік на тры чвэрці ціха грае
На небе зоркі дагараюць
На Гнойным баль, і блізкі ўжо фінал
І ён нешчасьлівы, на жаль

Тут, на Гнойным, так заўсёды
Сьмех і смутак ходзяць разам
Сьпірту дай замест шампану
Трэба выпіць за Рамана.

# НАРОДНЫ АЛЬБОМ

## Пад прыгнётам панскім

Пад прыгнётам панскім
Мы расьлі-сталелі,
Пад прыгнётам панскім
Гралі мы вясельле.

Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
Пад прыгнётам панскім,
Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
Гралі мы вясельле.

Пад прыгнётам панскім
Дзетак завадзілі,
Пад прыгнётам панскім
Грамаце вучылі.

Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
Пад прыгнётам панскім,
Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
Грамаце вучылі.

Пад прыгнётам панскім
У войска праваджалі,
Пад прыгнётам панскім
З войнаў сустракалі.

Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
Пад прыгнётам панскім,

Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
З войнаў сустракалі.

З войнаў сустракалі,
Чарку выпівалі,
А праз год, праз другі
Ўнукаў калыхалі.

Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
А праз год, праз другі,
Ла-ла-ла, ла-ла-ла,
Ўнукаў калыхалі.

Ўнукаў калыхалі,
Песьні ім сьпавалі
Пра гады цяжкія
Пад прыгнётам панскім.

## Маладое піва

Нeяк у дуброве,
Неяк у зялёнай
Каштавалі хлопцы
Піва маладое.

Піва маладое
Ў куфлі налівалі
І адзін адному
Гэтак прамаўлялі:

Першы куфаль піва
Вып'ем за сустрэчу,
Вып'ем за сустрэчу,
За цудоўны вечар.

А па першым куфлі
Трэба паўтарыць,
Маладое піва
Заўсёды шуміць.

Вып'ем другі куфаль
Маладога піва
За дзяўчатак нашых,
Каб жылі шчасьліва.

Трэці куфаль вып'ем
За нас, за малойцаў,

Каб сьвяціла сонца
Ў нашае ваконца.

А чацьверты куфаль
Вып'ем за сяброўства,
Каб канаць ў самоце
Нам не давялося.

Пяты п'ем за тое,
Каб добра жылося,
Каб елася смачна,
Соладка пілося.

Шосты вып'ем моўчкі
За тых, хто ня з намі,
Каб ня зналі гора,
Каб бяды ня зналі.

Сёмы за край родны,
Восьмы за Пагоню,
Каб гарэлі зоркі,
Каб ляцелі коні.

П'ем дзявяты куфаль
За добрых людзей.
Засьпявайма разам
Гэй-гэй-гэй!

## Ать-два, левой!

Ать-два, левой!
Ать-два, правой!
Наше дело правое!
И всем встречным-поперечным
Мы желаем здравия.

Выходите, привечайте,
С хлебом-солью нас встречайте,
Обнимайте, целовайте,
Мы свои, вы так и знайте.

Не судите слишком строго,
Что шагаем мы не в ногу.
Вот немного отдохнём
И опять шагать начнём.

Ать-два, левой!
Ать-два, правой!
Наше дело правое!
И всем встречным-поперечным
Мы желаем здравия.

## Край ты мой, край

Мы дапіць не пасьпелі да дна,
Як раптоўна пачулі «вайна».
Ты сказаў мне: «Даруй і бывай»
І пайшоў бараніць наш край.

Край ты мой, край,
Грай, гэйнал, грай,
Дай веры, дай,
І мы пераможам.

Мы ў шэрых мундзірах
Пад шэрым крывіцкім небам
Перад навалай з Усходу
Станем мурам каменным.

Будзем стаяць непарушна,
Будзем стаяць непахісна,
З намі вера і праўда,
З намі Божая Маці,

З намі анёл-абаронца,
Будзем стаяць бясконца,
Пакуль толькі хопіць моцы,
Пакуль толькі будзем жывы.

Край ты мой, край,
Грай, гэйнал, грай,
Дай веры, дай,
І мы пераможам.

## Матка Боска Вастрабрамска

Халодным жнівеньскім днём
Я кратаю струны халоднай гітары,
Скажы, чаму гэты дзень
Пафарбаваны на колер хмары?

Халодным жнівеньскім днём
Ільецца дождж на мёртвую пожню,
Даруй, але я хачу быць
Сёньня слабой і бездапаможнай.

Халодным жнівеньскім днём
Ты так далёка, што ня ўбачыць.
Ну як тут мне не сумаваць,
Ну як тут мне не заплакаць?

Халодным жнівеньскім днём
Адчыняю сэрца браму.
Матка Боска Вастрабрамска,
Зьлітуйся над намі.

Халодным жнівеньскім днём
Дай крыху цяпла і сонца.
Скажы, чаму гэты дзень
Такі халодны, такі бясконцы?

## Эх, змагаліся

Эх, змагаліся мы,
Ох, стаміліся,
Моцна біліся,
Запыліліся.

Пад крывой сасной
Прыпыніліся,
На сыру зямлю
Паваліліся.

Пад крывой сасной,
На сырой зямлі
Мы палёжвалі
Ды віно пілі.

Эх, па чарачцы
Ды па малюсенькай,
Эх, па шкляначцы
Ды па паўнюсенькай.

Эх, па куфліку
Ды па глінянаму,
Эх, па цэбрыку
Ды па драўлянаму.

Эх, па вядзерачку
Ды па дзевяцілітроваму,

Эх, па дзежачцы
Ды па бяздоньненькай.

Эх, па цыстэрначцы
Ды як хацелась выпіць нам,
Але труба, на жаль,
Нам падала сыгнал.

Мы, як штыхі,
Зь зямлі паўскоквалі
І крокам рушылі
Ў кірунку Копыля.

## Кантрабандыст

Тут на памежжы
Каменныя вежы,
Жалезныя дзьверы,
Замкі і засовы,
Таемныя пасткі,
Падземныя сховы,
Маўклівыя маскі
На тварах аховы.
Ім сэрцы і душы
Аплецены дротам
І токам атручана кроў.
А ў кантрабандыста
Блакітныя вочы,
Ён працуе штоночы,
Робіць цёмную справу,
Парушаючы Права
І закон крымінальны,
Праз граніцу цягае
Кантрабандны тавар.
А ў кантрабандыста
Сталёвыя нэрвы,
Ён гуляе ў цемры
Ў небясьпечныя гульні.
І драпежная куля
Нецярпліва чакае,
Каб нарэшце спаткацца,
Каб напіцца крыві.
Ды ў кантрабандыста

Ёсьць ад кулі замова,
Не баіцца ён змовы
І таемнае пасткі,
Не баіцца судзьдзі ён,
Не баіцца ён кратаў,
Ён з-за кратаў дахаты
Ўсё адно ўцячэ.
Бо ў кантрабандыста
Ёсьць на сэрцы наколка,
Там ключы ды іголка
І кажанавы крылы.
Ён турэмныя дзьверы
Тым ключом адмыкае
І ў цемры зьнікае,
Не сказаўшы «гудбай».

## Болек ды Лёлек

Мы два польскіх шпіёны,
Болек ды Лёлек, Лёлек ды Болек,
Запомніце нашы імёны,
Болек ды Лёлек, Лёлек ды Болек.

У нашых кішэнях цукеркі з атрутай,
У нашых кішэнях маўзэр з кольтам,
У нашых кішэнях сьпісы партыйцаў,
У нашых кішэнях пляны заводаў,

У нашых кішэнях мапы ды лупы,
У нашых кішэнях нажы і запалкі,
У нашых кішэнях фальшывыя візы,
У нашых кішэнях вусы-самаклейкі.

Мы крочым упарта па пыльнаму тракту,
Напад за нападам, тэракт за тэрактам,
Мы ўглядаемся ў мапу праз лупу,
Мы маем намеры патрапіць у дупу
Маланкай сваёй агнявой.

## Настаўнік Рагойша

Тысяча дзевяцьсот дваццаць шосты год.
Мястэчка Ракаў пры панскай Польшчы.
У цэнтры плошча. На плошчы касьцёл.
Па плошчы ідзе настаўнік Рагойша.
Ён апрануты па апошняй модзе:
На ім галіфэ, камізэлька ды гальштук,
На ім акуляры ды новыя боты
(Новыя боты добрай работы!).
Сам ён тутэйшы – вярнуўся нядаўна.
Вучыўся на фізыка ў Ратэрдаме.
Ну, ёсьць такі горад недзе ў Эўропе.
Але гэта, зрэшты, ня вельмі істотна.
Дык вось, пра Рагойшу: у школе працуе,
А дома чытае ды нешта майструе.
Напрыклад, паставіў на даху антэну,
Зрабіў зазямляльнік, аплёў дротам сьцены
І прыстасову паставіў у хаце –
Даруйце, панове, завецца «адапцер»...
Яшчэ ёсьць дынамік і ручка настройкі.
А ў школе, сабака, паставіў мне тройку.
Але не пакрыўдзіўся я на Рагойшу –
Я ў школе ня лепшы, але й ня горшы.
Затое Рагойша сказаў па сакрэту,
Навошта паставіў антэніну гэту.
Маўляў, яна ловіць нябачныя хвалі,
Якія, як быццам, у часе блукалі
Ці будуць яшчэ яны ў часе блукаць...
Даруйце, панове, мне цяжка казаць.

Я, кажучы шчыра, ня ўсё разумею,
Але кажу праўду, кажу, як умею.
Дакладней, кажу, як тлумачыў Рагойша,
А ён, можа, зблытаў ці перабольшыў.
Але прысягаю: уночы аднойчы
На ўласныя вушы, на ўласныя вочы
Я бачыў і чуў, як у Рагойшавай хаце
Сьвяціўся і граў той, даруйце, адапцер,
І слухаў Рагойша вар'яцкія гукі –
Пякельныя енкі, пачварныя хрукі,
Як быццам бы д'ябал пілікаў на скрыпцы.
І мне закарцела пабегчы ў паліц'ю.
Але не пабег я. Стаяў скамянеўшы,
Збляднелы, нібыта два тыдні ня еўшы.
І вось адчыняюцца дзьверы ў хаце,
І кажа Рагойша: «Заходзьце, сядайце!»
Заходжу, кажу: «Вечар добры ў хату!»
«Год тысяча дзевяцьсот семдзесят пяты»,–
Кажа ён мне і дзіка рагоча.
І я зразумеў: вар'яцее Рагойша.
Шалее Рагойша. І я адчуваю,
Як б'е ў галаву маю музыка тая
І я паміж волі раблюся вар'ятам
Ад музыкі, гранай у семдзесят пятым.
Я страціў прытомнасьць ад року ды панку,
З дурной галавой ачуняў толькі ранкам
І болей ніколі ў жыцьці да Рагойшы
Я не пайду... Лепш нап'юся ў Мойшы,
У простай, звычайнай карчме местачковай
Гарэлкі празрыстай, гарэлкі жытнёвай!

## Крэўская полька

Гэй, музыкі, грайце польку,
Грайце да самога золку,
Я хлапчына зухаваты,
Не пайду я спаць дахаты.
Гэй, музыкі, польку грайце,
Дайце чаду, жару дайце,
Гэй, музыкі, дайце жару,
Я шукаю сабе пару.
У цябе на носе болька,
У мяне на лбе гузак,
Я з табою танчу польку,
Ты са мною кракавяк.
Вяк-вяк-вяк,
Вякае гітара,
Чым жа ж, чым
Мы ня добра пара?
Пара добра, трыё лепей,
Тут ня Жлобін і ня Лепель,
Тут культурнае мястэчка,
Твае вусны як парэчка.
Полька справа, полька зьлева,
Ты з Варшавы, а я з Крэва,
Я зь мястэчка, ты з Варшавы,
Вось жа ж во, такія справы!
Карацей, паўсюдна полькі,
Паміж імі беларус,
Чым ня швэдзкі трохвугольнік?
Чым ня тройсьцьвянны саюз?

## Я, да жалю, ня пан

Я, здаецца, ня тут,
Я, напэўна, ня там,
Я, да жалю, ня пан,
Я, на шчасьце, ня хам.

Я твайго не вазьму,
Я свайго не аддам.
Вось замкнёны мой дом,
Вось ля дома паркан.

Ад нуды ды бяды
Уратуюся сам.
Час зьбіраць камяні,
Час расьці камяням.

Я, да жалю, ня пан,
Я, на шчасьце, ня хам,
Я, здаецца, ня тут,
Я, напэўна, ня там.

Неакрэсьлены стан,
Незавершаны лад,
Я стаю на мяжы
Паміж дрэваў і хат.

Вось дарога туды,
Вось дарога назад,
Тут дубы ля вады,
Там шыпшынавы сад.

Я, здаецца, ня тут,
Я, напэўна, ня там,
Я, да жалю, ня пан,
Я, на шчасьце, ня хам.

Я стаю на мяжы,
Я іду па нажы,
Божа, дапамажы
Захаваць раўнавагу.

## Адэлька

У суботу-нядзельку
Апрануся прыстойна,
Апрану камізэльку
І кашулю з бавоўны,
Навяжу сіні гальштук
І пайду да Адэлькі,
Каб ў яе таварыстве
Зазірнуць у бутэльку.

Трай-ля-ля-ля-ля,
У суботу-нядзельку,
Трай-ля-ля-ля-ля,
Зазірнуць у бутэльку.

А ў бутэльцы на дне
Чорт рагаты жыве
І паказвае мне
Адмысловыя дулі.
Згінь, нячысьцік рагаты,
Не пагань маё сьвята,
Шчэ крыху пагасьцюю
У Адэльчынай хаце.
Вып'ю чарку-другую,
Зьем капусты з сардэлькай,
Засьпяваю, а потым
Пацалую Адэльку.

Трай-ля-ля-ля-ля,
У суботу-нядзельку,
Трай-ля-ля-ля-ля,
Пацалую Адэльку.

Ах, Адэлька, Адэля,
Не Хрысьціна, ня Гэля,
Не Альжбэта, а ты
Да самое труны
Будзеш у сэрцы маім
Назаўсёды.

## Аргентынскае танга

Штовечар у клюбе
Праходзілі танцы,
Прыходзілі дзеўкі,
Зьбіраліся мальцы.
І танчылі моўчкі
Да самага золку,
А ранкам ізноўку
На працу ішлі.

А там, дзе дно,
Мне ўсё адно
Ёсьць толькі ты,
Ёсьць толькі танга.
Твой дотык
Як вецер,
Твой позірк
Як студня,
Дай мне напіцца,
Я хачу піць.

Аргентынскае танга,
Экзатычная кветка,
Па-над вёскай віруе
Ды зацягвае нас
У духмяную цемру,
У салодкую пастку,
Ў аксамітную багну
На бяздоннае дно.

А там, дзе дно,
Мне ўсё адно
Ёсьць толькі ты,
Ёсьць толькі танга.
Твой дотык
Як вецер,
Твой позірк
Як студня,
Дай мне напіцца,
Я хачу піць.

## Мой паляўнічы

Паляўнічы ты мой, паляўнічы,
Ходзіш ты па лясох маляўнічых,
Ходзіш ты па палёх верасовых,
Абмінаючы вёскі ды сёлы.

А прыходзіш на хутар мой зрэдку
І стаіш, нібы слуп, на падворку.
Можа, ты ў мяне закахаўся?
Можа, ты заблукаў надвячоркам?

Паляўнічы ты мой, паляўнічы,
Ты ня стой, як той слуп, на падворку,
Паглядзі на мяне, яка сьлічна,
Прынясі ты мне злату вавёрку.

Прынясі ты мне злату вавёрку,
Упалюй ты мне срэбну лісіцу,
Я пашыю шыкоўнае футра,
Апрану і паеду ў сталіцу.

Ах, Варшава мая, ах, сталіца,
Буду там баляваць, весяліцца,
Буду ў футры сваім красавацца
І на санках ў Лазэнках катацца.

Буду я частавацца шампанам,
Буду слухаць накцюрны Шапэна,
Буду я забаўляцца, а рана
Я вярнуся ў родны засьценак.

Паляўнічы ты мой, паляўнічы,
Ходзіш ты па лясох маляўнічых,
Ходзіш ты па палёх верасовых,
Ну чаму ж ты такі невясёлы?

Паглядзі на мяне, яка сьлічна,
Паляўнічы ты мой, паляўнічы.

## Юзік

Усім прывітаньне,
Завуць мяне Юзік,
Я хачу жыць
У Савецкім Саюзе.

Я просты хлопец,
Я хлопец зь вёскі,
На піпараме
Пілую я дошкі.

Дошкі пілую
Ад рана да рана,
А скутку няма,
Бо працую на пана.

Маю заробак –
Мізэрныя грошы,
П'ю самагонку,
Куру папіроскі.

Я супраць прыгнёту
Паноў і падпанкаў,
Чакаю з надзеяй
На рускія танкі.

## Казік

Вітам, панове,
Я Казік Пясецкі,
Я рэакцыйны
І антысавецкі.
Я рэпрэзэнтант
Ад пануючай клясы,
Эксплюатую
Працоўныя масы.

Тут я праездам,
Па справах прыватных,
Справы зраблю
І паеду дахаты.

Мешкам у Вільні,
Маю там краму,
Мода для дамы
І мода для пана.

Грошай хапае,
Усё будзе добра,
Нех жые Польска
Ад мора да мора.

## Бойка на лузе

Сустрэліся неяк
Выпадкам на лузе
Юзік ды Казік,
Казік ды Юзік.

Казік сьпяшаўся
Ды не павітаўся,
Юзік пакрыўдзіўся
Ды раззлаваўся.

Юзік спыніўся
Ды запытаўся:
– Хто ты такі?
Адкуль ты ўзяўся?
Казік ў адказ
Далікатна змаўчаў,
А Юзік пакрыўджаны
Ў лоб яму даў.

Казік за Юзікаў
Гузік схапіўся
Ды на сырую
Зямлю паваліўся.

Вось жа ж наступствы
Сустрэчы на лузе –
Ходзіць па вёсцы
Бяз гузіка Юзік.

## Ja śpiewam po polsku

Ja śpiewam po polsku swoje piosenki
Dla was, kochane moje panienki.

Ja jestem po prostu samotnym aktorem,
Słuchajcie mnie rano, słuchajcie wieczorem,

Słuchajcie mnie w nocy, słuchajcie, słuchajcie,
Ja kocham was mocno, i wy mnie kochajcie.

A więcej niczego ja nie potrzebuję,
I tylko wam wszystkim serdecznie dziękuję.

## Аліцыя

На вакацыях пад акацыяй
У альтанцы сядзела Аліцыя,
Элегантная ды выкшталцоная,
І чытала напамяць Гарацыя.

У кампаніі дзьвюх каляжанак,
Ведучы дыялёгі прыватныя,
Пілі каву яны з цынамонам
З парцалянавых філіжанак.

Час ад часу да іх кавалеры
Заглядалі, нібы выпадкова,
Кавалеры мелі манеры
І намеры цнатліва-прыстойныя.

Хлопцы трымаліся з годнасьцю
Стрыманай ды зухаватай
І зрэдку любілі дзяўчат
Далікатна спалохаць вужакай.

А побач ў балоце жабы
Песьні сьпявалі маркотныя
На тыя адвечныя тэмы,
Што сэрца хвалююць шляхотнае.

Так мінала ў нябыт пакрыёма
Тое ціхае, цёплае лета,
На парозе стаяла восень,
Пагражаючы пісталетам.

## Лалалала

У нашым мястэчку восень.
І прыхадні розныя лазяць па хатах,
Тыцкаюць пальцамі ў сала
І наводзяць свае парадкі.
У мяне на душы паскудна,
І словаў бракуе, каб выказаць гэта,
І не хапае моцы,
Каб далей гэта моўчкі трываць.
Я пайду па мястэчку,
Вазьму ў рукі кала
І засьпяваю ўголас,
Каб чулі ўсе:
– Лалалала!

## Дарагія маі масквічы

Дарагія маі масквічы,
Уважаімыі ленінградцы,
Ні к чыму нам Атчызну дзяліць,
А цем пачэ нам незачэм драцца.

Прыізжайці ка мне ў Беларусь,
Прывазіці друзей і знакомых,
Мойце рукі, садзіцісь за стол,
Атдыхайці і будзьці как дома.

Дарагія маі пскавічы,
Уважаімыі растаўчане,
Хваціт места вам всем у міня
На дзіване, сафе і тапчане.
А ні хваціт, так есьць жа ш краваць,
Есьлі нада, магу пацісьніцца,
Так давайці ж, друзья, сібраваць,
Как на Белай Русі гаварыцца.

Прыізжайці ка мне паскарэй,
Просім міласьці, міласьці просім.
Беларусь, край аткрытых дзьвірэй,
Горад Гродна, Савецкая, 8.

# Сьнежань, Студзень, Люты

Прыйдзе зіма, і Сьнежань
Лісьце заваліць сьнегам
Мы адсьвяткуем разам
Божае Нараджэньне

Цёмна-зялёны водар
Будзе ад елкі ў доме
Раніцай прыйдзе Студзень
І зьменіцца нумар году

Халодна зробіцца ў хаце
Бо Люты пачне лютаваці
Грукацца ў вокны і дзьверы
Са злосьці, што ён кароткі

Сьнежань, Студзень і Люты
Сьнегам, сьцюжай і лёдам
Будуць псаваць настрой нам
І вушы будуць марозіць

А мы павыцягваем з шафы
Шалікі, швэдры, пальчаткі
Шкарпэткі з авечае воўны
І зімнія палітоны

Мы апранемся цёпла
Хай тады нас марозіць
Калі толькі вопратку гэтую
Моль яшчэ не пажэрла

Калі толькі гэтую вопратку
Яшчэ не пажэрла моль!

## Майская песьня

Раз, два, тры, раз, два, тры,
Айн, цвай, драй!
Кінь у сьмецьце свой смутак-адчай,
Калі хочаш сьпяваць, то сьпявай.
Пачакай, і вандроўнік Май
Прыйдзе ў наш занядбаны край.

Раз, два, тры, раз, два, тры,
Айн, цвай, драй!
Па дарозе птушыных зграй,
Цераз цемру і празь небакрай,
Там, дзе пушча, і там, дзе гай,
Ён ідзе, ратаўнік і ратай.

Раз, два, тры, раз, два, тры,
Айн, цвай, драй!
Не сядзі, а хадзі сустракай,
Уголас песьні сьпявай альбо грай,
У зялёнае шкло налівай
Выкшталцоны празрысты «Такай».

Раз, два, тры, раз, два, тры,
Айн, цвай, драй!
А як можаш лятаць, то лятай,
Толькі іншым не замінай,
Зрэшты, ведай і памятай,
Што высока над намі ёсьць Рай.

Раз, два, тры, раз, два, тры,
Айн, цвай, драй!
Адгуляе і пойдзе Май,
Не сказаўшы нікому «бывай»,
Хай ідзе, ты яго не трымай,
Веры дай і ўсё будзе «най» –

Найпрыгажэйшым,
Найвесялейшым,
Найразумнейшым,
Найлепшым у сьвеце.
Най-най. Най-най-най.
Раз, два, тры, раз, два, тры,
Айн, цвай, драй.

## Простыя словы

Простыя словы
Простыя рэчы
Хлеб на стале
Полымя ў печы

Гэта так проста
Гэта так добра
Як з галавою
Залезьці пад коўдру

Прыцемкам сінім
Зімовай парою
У доме бацькоўскім
Усё так знаёма

Ёсьць чым сагрэцца
Ёсьць дзе схавацца
У доме бацькоўскім
У матчынай хаце

Усё так надзейна
Усё так грунтоўна
Што тут дадаць
Хіба што нічога

Можна жыць далей
Дзень прыйдзе новы
Дабранач, паненкі
Дабранач, панове

# Змест

Тэксты
На дне філіжанкі кавы 5
Гадаваньне Гадо 6
«Ад былых палацаў белых...» 8
Вакно 9
Альтэрнатыва шэрай сьцяны 10
Пан крот 11
Пан крот 2 12
Начная варта 13
Цемра 15
Вера ахвяры 17
Радыё Сталін 19
«На белы аркуш...» 20
Баляда пра канспірацыю 21
«Падае сьнег зранку...» 22
Мы чакаем Калядаў 23
Пілёты 25
Неба мяняе колер 27
«Над горадам шэрая хмара...» 28
Мая краіна 29
«На нашай вуліцы...» 31
Цудоўны вечар 33
Калыханка для дарослых 34
Яшчэ адна калыханка 35
Здаецца... 36
Шафа 37
«"Там заўсёды сьвежы хлеб", – кажа мая бабуля...» 38
Шуфляды 39
Вуліца 40
Дзьверы 41
«Цёмным зімовым ранкам...» 42
Атрамантавы Кот 43
25, 26, 27 44
Сьвятло ў цемры 46
Схаванае сэрца 47
Крылы анёлаў 49
Восень 50

Шанты


52 «Не пытайся як справы...»
53 Аку-Аку
55 Мёртвы штыль
57 Ultima Thule


Пераклады


60 Аўтабіяграфія (Perfect)
63 Белы сьцяг (Republika)
65 Так так гэта я (Grzegorz Ciechowski)
67 Свабода (Chłopcy z Placu Broni)
68 Нязнаныя дні (Marek Grechuta)
70 Тое, што адчуваеш, тое, што ведаеш (Brygada Kryzys)
71 Яна (Louise Attaque)
73 Баль на Гнойнай (Stanisław Grzesiuk)


Народны альбом


76 Пад прыгнётам панскім
78 Маладое піва
80 Ать-два, левой!
81 Край ты мой, край
82 Матка Боска Вастрабрамска
83 Эх, змагаліся
85 Кантрабандыст
87 Болек ды Лёлек
88 Настаўнік Рагойша
90 Крэўская полька
91 Я, да жалю, ня пан
93 Адэлька
95 Аргентынскае танга
97 Мой паляўнічы
99 Юзік
100 Казік
101 Бойка на лузе
102 Ja śpiewam po polsku
103 Аліцыя
104 Лалалала
105 Дарагія маі масквічы
106 Сьнежань, Студзень, Люты
107 Майская песьня
109 Простыя словы

кнігарня
ЛОГВІНАЎ
ПР. НЕЗАЛЕЖНАСЦІ, 37А
МІНСК

Літаратурна-мастацкае выданне

Анемпадыстаў Міхаіл Уладзіміравіч

ГЛЫБОКА-ГЛЫБОКА, НА ДНЕ ФІЛІЖАНКІ КАВЫ

Рэдактар Вольга Гардзейчык
Карэктар Ліда Наліўка
Вёрстка Кацярынка Пікірэня
Дызайн вокладкі Міхал Анемпадыстаў

Падпісана да друку 15.01.2013 г. Фармат 84х104 1/32
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 2,2 Улік.-выд. арк. 3,93
Наклад 200 асоб. Замова 428.

Выдавец І. П. Логвінаў. ЛИ № 02330/0494468 ад 08.04.2009.
Пр-т Незалежнасці, 19-5, 220030, г. Мінск. lohvinaupress@gmail.com
Надрукавана на капіравальна-памнажальнай тэхніцы І. П. Логвінава



Глыбока-глыбока, на дне філіжанкі кавы
Пачынаецца новы дзень, доўгі і невядомы
Водару сьцяг уздымаецца ў неба
Урачыста-гаркавы, як перамогі і страты
Цёмна-брунатны, як вопратка вояў і мніхаў
Як хлеб, як ральля, як атрамант, як ноч
Колер для літараў, нотаў, малюнкаў
Смак спатканьняў на некалькі словаў
На адну філіжанку, на момант, які застанецца
З намі альбо паасобку ў кожнага з нас
На кожны глыток
Па паэме, кантаце, партрэце. Вось і апошні
Мінае дзень. Няма чаго варажыць на гушчы
У пустой філіжанцы не адбіваецца неба

9 789855 620342

Логвінаў

Галерэя Б

Міхал Анемпадыстаў

Глыбока глыбока, на дне філіжанкі кавы